Сямейная газета

Выпуск № 21 (112)

## «ФЕФЕКТ ФІКЦЫІ»

Калі гэты выраз чуюць нашы бацькі і бабулі з дзядулямі, то практычна адразу ўспамінаюць іншыя крылатыя дыялогі з фільма «Па сямейных абставінах», а менавіта: «Скажи «февочка». — «Девочка». — «Скажи «ыба». — «Селёдка!» і «фіццаць фелітары алфавіта. Сучасныя маладыя бацькі большасці гэтых «лагапедычных» цытат не ведаюць — затое, на жаль, шчыльна знаёмыя з самімі лагапедамі. Недаразвіццё маўлення, алалія — маторная ці сэнсарная, афазія, дызартрыя, заіканне, дыслексія, дысграфія — кагосьці гэтыя дыягназы завочна палохаюць, а для кагосьці яны — дадзенасць, з якой трэба нешта рабіць. Перадусім — знайсці добрага лагапеда-дэфектолага, які не толькі мае адпаведную адукацыю і стаж працы, але з якім і дзіця пойдзе на кантакт, і бацькі будуць на хвалі ўзаемаразумення.

Зноў жа прадстаўнікі старэйшага пакалення, па-першае, схільныя праменшаць значнасць праблемы — што, дзіця не гаворыць ці дрэнна гаворыць? Ат, перарасце, вунь, Леанарда да Вінчы да чатырох з паловай гадоў наогул маўчаў, а Эйнштэйн да сямі гадоў быў косназыкім, а якія людзі выраслі! Па-другое, часта нават педыятры лічаць крыніцай усіх маўленчых бед нашу нядбайнасць і «тэхналагізаванасць» — маўляў, юным матулям прасцей даць у рукі дзіцяці смартфон або планшэт, чым пачытаць яму казку, а вось калі б удзялялі малому больш увагі, то і праблем не было б. Аднак неўролагі і лагапеды гавораць, што гэта толькі вяршыня айсберга, бо ўнутраных і знешніх прычын узнікнення маўленчых праблем, цяжкасцяў з чытаннем або пісьмом значна больш. І выяўляюцца яны не толькі ў мноства цяперашніх дзяцей, але нават у дарослых — балазе, сёння дыягностыка працуе ў разы лепей, чым «цццаць» гадоў таму. Але рэч у тым, што чым раней выяўляюць парушэнне, тым больш паспяховай будзе яго карэкцыя. Проста камусьці на «пастаноўку» аднаго-двух гукаў спатрэбіцца некалькі месяцаў, камусьці на выпраўленне больш сур'ёзных праблем — шмат гадоў і бяздонны запас цярпення, камусьці дыягназ атруціць усё жыццё, а хтосьці можа шчасліва картавіць да старасці і нікольку гэтым не абцяжарваецца.

...У маёй малодшай дачкі, мяркуючы па частаце згадак, улюбёны сябар... Лагапед дзіцячага садка Аліна Уладзіміраўна. Выбягаючы з дзвярэй групы, малая цягне мяне менавіта да яе дзвярэй, а па дарозе дадому расказвае — хоць з большага і на «дзіцячай кітайскай», — што сёння яны чыталі казкі альбо гаварылі пра садавіну, цацкі, сваякоў... І я бязмежна ўдзячная гэтаму педагогу, якая ўмее зацікавіць, разгаварыць нават самае зацятае і сарамлівае малое, растлумачыць дзецям са звычайных, нелагапедычных груп, што «фефект фіцыі» — гэта не загана і не хвароба, а бацькам не стамляецца даводзіць і нагадваць, што мы ўсе — каманда, ад зладжанасці якой залежыць вынік. «Не чакайце, што усё само пройдзе, але і ні ў якім выпадку не стаўце крыж на сваім дзіцяці — чым больш мы працуем, праводзім масаж, фізіяпрацэдуры і гэтак далей, тым лепш. І нават калі вы дрэнна разумееце сваё дзіця, хіба ад гэтага любіце яго менш?» — гаворыць яна на бацькоўскіх сходах. І гэтыя некалькі фраз даюць надзею, што рана ці позна дзіця пяройдзе з «кітайскай дзіцячай» на нармальную мову і наогул усё ў нас атрымаецца.

Так што дзякуй, Аліна Уладзіміраўна. Вам і іншым спецыялістам, якія дапамагаюць дзецям і дарослым гаварыць, чытаць і лепш разумець адзін аднаго, — хай сабе мы і не Эйнштэйны. З Міжнародным днём лагапеда вас!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

50+: жыць цікава

# «ГАЛАВА? А ЧАМУ ЯНА ПАВІННА БАЛЕЦЬ?!»



**72-гадовая гродзенка працуе фітнес-трэнерам, вандруе па свеце і зусім не ўжывае лекаў**

**Лічыце неверагодным? А цяпер уважліва паглядзіце на фота, перш чым працягваць чытаць артыкул далей, і адкажыце сабе на пытанне: «Ці дасі гэтай жанчыне столькі гадоў?» Здаецца, адказ відавочны.**

Нінель Блахіну ведаю ўжо некалькі гадоў, але кожны раз, калі лёс дарue шанц чарговы раз падтрымаць нашы стасункі, раблю тое з вялікім задавальненнем, бо гэта жанчына не проста дзеліцца сваёй магутнай энергетыкай, а на сваім асабістым прыкладзе даказвае — узросту і старасці няма наогул, вы выглядаеце так, як самі сябе адчуваеце. Нездарма год таму яна прыняла ўдзел у вядомай праграме Максіма Галкіна «Старэйшы за ўсіх», дзе палымяна станцавала рок-н-рол — усім на зайздрасць!

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

# ЗРАЗУМЕЦЬ І ДАРАВАЦЬ?

### Што павінны ведаць бацькі пра пакаранне і заахвочванне дзяцей

**Ці варта караць дзяцей? Ці можна ляпнуць ніжэй спіны ці даць па руках, калі яно «не разумее па-іншаму»? Што вырасце з дзіцяці, якога ніколі не каралі? Ці варта матэрыяльна заахвочваць добрыя адзнакі? І чаму ў вайне паміж бацькамі і дзецьмі не бывае пераможцаў? Пра гэта мы распыталі псіхолага Гарадскога дзіцячага клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Галіну СТАНЧЫК.**

## Караць нельга растлумачыць

***— Галіна Антонаўна, ці трэба караць дзяцей? Ці магчыма іх выхаваць без пакарання?***

— Напэўна, усе чулі пра цэлую сістэму выхавання без пакарання, ёй прысвечаны шматлікія артыкулы і кнігі. Але на гэты конт ёсць анекдатычная гісторыя, калі ў транспарце сядзіць дзіця і пэцкае абуткам белае паліто жанчыны, якая знаходзіцца насупраць. Яна просіць маці яго супакоіць, на што тая адказвае: маўляў, сваё дзіця яна не карае, а выхоўвае па асаблівай сістэме. Тут да гэтай матулі падыходзіць малады чалавек, дастае з рота жвачку і прыклейвае ёй на лоб са словамі: «Мяне таксама выхоўвалі без пакарання»... Напэўна, бацькі, калі вырашаюць для сябе гэта пытанне, з жахам уяўляюць, як іх любімае дзіця можа вырасці монстрам, таму выкарыстоўваюць пакаранне як непазбежны і надзейны метад выхавання. Як жа яны губляюцца, калі аднойчы дзіця само прыносіць папружку і кажа: можаце мяне пабіць, але за ўрокі я не сяду. Ці само ўстае ў кут: я буду стаяць хоць усю ноч, але спаць не пайду. Таму бацькам трэба разумець, што такія метады хоць і працуюць, але вельмі абмежаваны час. А выхоўваючы без фізічнага ўздзеяння, мы ўсё ж такі думаем і працуем на будучыню. Фізічнае пакаранне, той жа кут ці пазбаўленне чагосьці эфект прыносяць не заўсёды. Часам пакаранне для дзяцей бывае перанесці лягчэй, чым зрабіць тое, чаго ад іх патрабуюць. Для бацькоў гэта нагода задумацца, чаму дзіця штосьці не выконвае: не хоча або не можа? Часцей за ўсё яно проста не можа выканаць пэўныя патрабаванні. Часам бацькі спрабуюць кіраваць дзіцем, якое не можа кіраваць сабой. Напрыклад, вы крычыце: «Зараз жа перастань плакаць!» А яно працягвае. І робіць гэта не на злосць вам. Яно проста не можа кіраваць сабой. Часта ад бацькоў даводзіцца чуць меркаванне, што важна пакараць дзіця, каб яно ведала, што за праступкам абавязкова надыдзе кара. Па прынцыпе «скраў — павінен сядзець у турме». Але ў адносінах бацькоў і дзяцей гэта працуе дрэнна. І трэба дакладна ўсведамляць, што дзеці, асабліва сучасныя, хутка разумеюць, што наша ўздзеянне абмежавана. І пытанне «А што ты мне зробіш?» часта задаюць не падлеткі, а дзеці 7—8 гадоў, а часам і меншыя.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*